Значит, лукавил господин Мельник? Собственно говоря, инициатива от Госкомитета уже исходила. У меня в руках документ, правда, без подписей и печатей: Постановление Совета министров РБ от 15 августа 2003 года №1074 "О внесении изменений в Постановление Совета министров РБ от 18 декабря №758": "Совмин РБ постановляет: пункт 1 Перечня должностей работников летного состава, работа в которых дает право на пенсию за выслугу лет (независимо от ведомственной подчиненности предприятий, учреждений и организаций), утвержденного постановлением Совмина РБ от 18 декабря 1992 года №758, ... изложить в следующей редакции: "1. Члены летных экипажей воздушных судов и других летательных аппаратов, бортоператоры". Поясню суть изменения. **В прежней редакции слово "бортоператоры" отсутствовало. А без него можно было трактовать фразу объемно, включая и бортпроводников. Новая же редакция бортпроводников полностью исключает, и они уже никогда не вернут свои деньги. Я спросила у господина Мельника, что это за документ.**

— Откуда он у вас? Это только проект... — занервничал руководитель "бедного" Государственного комитета по авиации.

Хорош тот закон, что дает жизнь, и плохо то, что ее разрушает. С этих позиций и должны приниматься все решения правительства. Надежда гражданина на справедливое решение это нормально. Но если каждый гражданин станет надеяться только на себя, то зачем тогда государство. В начале девяностых эти люди дважды потерпели от государства. Сначала у них отобрали накопленные на сберкнижках деньги, потом и заслуженный размер пенсии.

Поэтому говорить, что бывшие стюардессы сегодня не за чертой бедности только потому, что они получают на рубль больше той черты, которую установили люди, никогда не жившие на полтора рубля в день, по меньшей мере, безнравственно. И еще. Хорошо быть меценатом за счет государства.

Когда я была у депутатов Парфеновича и Новосяда, принесли план работы Палаты Представителей на весеннюю сессию. Вопрос о стюардессах там не значился. Депутаты недоумевали: "Мы же все документы лично в руки Попову отдали". И пообещали, что они внесут вопрос уже в ходе сессии. Но бывшие бортпроводники не стали дожидаться и написали спикеру Попову письмо, где просили назвать причину, по которой их вопрос не внесли в повестку весенней сессии, а получили очередную отписку от председателя комиссии по труду и соцзащиты. Господин Каменецкий вновь плачется об отсутствии средств. Президент страны по всем каналам ежедневно говорит об искоренении бюрократического подхода к проблемам граждан, а чиновники, как тот кот Васька, слушают, да и в ус не дуют. Так и хочется подсказать господам Попову и Каменецкому: не о дожде спрашивают адресаты, а о снеге, почувствуйте разницу.

"Если не получится решить вопрос в стране, будем подавать в Европейский суд, — говорят пенсионеры. **— Может, кто и доживет до положительного решения".**

Людмила ОСИНСКАЯ.

Атруціліся грыбамі

З пачатку года ў выніку атручванняў грыбамі ў Беларусі пацярпелі 14 чалавек. Пры гэтым адзін выпадак аказаўся трагічным: пенсіянерка са Слоніма (Гродзенская вобласць) памерла пасля ўжывання ў ежу адвару са смаржкоў.

Атручванні былі звязаны з ужываннем непрыдатных да ежы, ядавітых і ўмоўна прыдатных да яды (няправільна прыгатаваных) грыбоў. Моцнадзейныя яды, што ўтрымліваюцца ў непрыдатных да ежы грыбах, не разбураюцца пры кулінарнай апрацоўцы. Захворванне пачынаецца, як правіла, раптоўна і часцей за ўсё ўначы, праз 3—12 гадзін пасля ўжывання ўмоўна прыдатных да ежы грыбоў. Першымі сімптомамі з'яўляюцца боль у жываце, нястрымнае ванітаванне, панос, слабасць, галаўны боль, а пасля могуць з'явіцца сутаргі, галюцынацыі і трызненне. Лятальнасць пры атручванні непрыдатнымі да ежы грыбамі дасягае 25—50 працэнтаў.

Спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя (РЦГЭіГЗ) нагадваюць, што да ўмоўна прыдатных да ежы грыбоў адносяцца некаторыя віды сыраежак, свінушкі, смаржкі, ваўнянкі, чарнушкі і іншыя грыбы.

Вольга АСІПЕНКА.

СУД!

За покушение на убийство...

Гомельчанин Сергей Ларкин сильно обиделся, застав сожительницу в компании подруг за выпивкой. Обиделся не за то, что женщина находилась в нетрезвом виде, а за то, что не дождались его и преждевременно начали сабантуй. Избив ее вначале руками, свалил на землю и принялся... топтать ногами. С черепно-мозговой травмой, разрывом толстой кишки и многочисленными переломами ребер "скорая помощь" увезла пострадавшую в больницу.

За умышленное причинение тяжких телесных повреждений, опасных для жизни и совершенных способом, носящим характер мучения и истязания, 25-летний сварщик КУП "Горэлектротранспорт" по приговору суда Железнодорожного района Гомеля направлен в исправительную колонию усиленного режима на восемь лет, где заодно пройдет курс принудительного лечения от хронического алкоголизма. За лечение потерпевшей ему предстоит выплатить 1 миллион 200 тысяч рублей в пользу областной клинической больницы и возместить жертве садистских действий 3 миллиона рублей в возмещение причиненного морального вреда.

35-летний житель 3-го микрорайона Светлогорска после расторжения брака из-за злоупотребления алкоголем, из квартиры не ушел и остался проживать с бывшей семьей под одной крышей. Ссор и скандалов отнюдь не поубавилось. После очередного возлияния разъяренный экс-супруг без причины устроил ссору, а затем повалил Л. на пол и принялся душить. Две соседки, прибежавшие на крики, еле-еле оттащили домашнего дебошира, не дав случиться трагедии. После их ухода тот не успокоился и схватился за кухонный нож. Удар в левую сторону груди по счастливой случайности тяжких повреждений жертве не причинил — "благодаря" непрочной стали клинок сломался, встретив на пути ребро. Потерпевшая вырвалась от изверга и вся в крови укрылась в соседней квартире. И даже после этого бывший супруг не успокоился — бегая с криками по подъезду и размахивая другим ножом, в поисках беглянки высадил входную дверь в другой квартире. К счастью, вскоре подоспели сотрудники милиции и медики.

За покушение на умышленное убийство суд Светлогорского района вполне справедливо лишил свободы нигде не работающего Владимира Игнатенко на десять лет, которые тот проведет в колонии усиленного режима и, как и предыдущий "герой", будет лечиться от пагубной привычки напиваться до скотского состояния.

Не стоит думать, что эти два случая — явление исключительное. Судьи других районных судов могут вспомнить чем-то похожие уголовные дела, рассмотренные за последние годы. И удивления такие случаи почти не вызывают — чего, мол, по пьянке не бывает. Привыкли — бытовуха.

А ведь страшно — народ спивается...

Не нажился...

Житель поселка Червоное, что на Житковщине, 30-летний Василий Черноголов приехал в Гомель на "гастроли". Нет, он не был знаменитым артистом театра или кино — обыкновенным ворюгой и уже имел две судимости. Его "гастроли" заключались в наживе на чужом имуществе.

Воскресным вечером на остановке общественного транспорта в самом центре города злоумышленник пристал к двум первокурсникам, возвращавшимся в общежитие дорожно-строительного техникума из поездки домой. Предупредив парнишек о весьма серьезных последствиях, которые могут наступить при неповиновении, гость областного центра отобрал сумку с продуктами, заботливо собранную родителями.

Испуганные вчерашние школьники поспешили в общежитие и пожаловались вахтерше. Та сразу сняла телефонную трубку и набрала спасительное 02.

Не прошло и получаса, как в общежитие позвонил дежурный Центрального ОВД и пригласил потерпевших явиться для опознания задержанного. Как оказалось, грабителя с отобранной сумкой по пути на железнодорожный вокзал задержал наряд патрульно-постовой службы. Сумка с домашними харчами возвратилась к законному владельцу, а заезжий гастролер по приговору суда Центрального района Гомеля на два с половиной года отправился в исправительную колонию строгого режима.

Михаил ОГОНЬКОВ.

Блохі ў штанах,

або Пра тое, як нашу эканоміку, у тым ліку і прыватную, губіць загадны сверб чыноўнікаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А сам, між іншым, падумаў: можа, я такі наіўны і на самай справе не разумею, што тым жа міні-кафэ трэба напамінаць, што яны павінны заключыць дамову з "Мінскводаканалам" на падключэнне вады, з РПА "Белгандальпрагрэс" — на ўстаноўку і абслугоўванне абсталявання, паставіць летам тэнты над столікамі, што туляцца ля дзяржаўных і прыватных устаноў грамадскага харчавання? А то ж усякае бывае...

Зайшоў я днямі перад ад'ездам электрычкай у Маладзечна выпіць кубачак кавы ў міні-кафэ (гэта там, дзе пуці №№ 23, 24) у палатцы, на якой было буйным шрыфтам на латыні напісана белым па чырвонаму "Кока-Кола", а там каля кожнага з двух столікаў сталага веку замест крэслаў ці стулаў пастаўлены на рабро дзве пластмасавыя скрыні з-пад шклатары. Прысеў, пачакаў, пакуль кава трошкі астыне, падзякаваў прадаўцам "за найлепшы ў свеце сервіс". І з думкай, што цяпер буду хваліцца сябрам і знаёмым, што ў прывакзальным кафэ піў каву, седзячы за столікам не як пан, а як БОМЖ ці БІЧ. Не кожны можа такім пахваліцца! Не буду расказваць толькі пра тое, што, калі ішоў да вагона электрычкі, час ад часу свярбелі тыя мясціны, у якія ўразаліся рабрыны пластмасавай шклатары...

Ці то тады, ці зараз набрыло, але падумалася: можа, калі знойдзецца час, няхай бы спадар М.Еўтухоўскі завітаў, едучы на працу, у тое кафэ і пасядзеў бы за кубачкам кавы на адной з тых скрыняў. Гарантую, што ў той жа дзень у парылцы, куды, спадзяюся, ён ходзіць, каб зняць чынавенскі сверб, на тым месцы, на якім сядзяць людзі, былі б выразна відаць адмецiны, што нагадвалі б турэмныя краты. Эксперымент, на маю думку, варты ўвагі! Можа, рызыкнеце, спадар М.Еўтухоўскі? Ну, было не было?!

Але ўсё гэта, між іншым, драбяза, няхай сабе часам і жартам сказаная. Хоць вы і самі добра ведаеце, што такіх дробязяў у нашым жыцці — аж спатыкаешся. З іх складваюцца нашы адносіны да культуры наогул і бытавой у прыватнасці, адносін да агульна-народных ці прыватнай уласнасці і людзей, што займаюцца прадпрымальніцтвам. Дарэчы, прыватнік не паставіў бы ў сваім кафэ скрыні з-пад шклатары, а прынёс бы з дому два-тры стулы, каб такім "фірменным" сервісам не адпалохаць кліентаў. Адносіны ж дзяржаўных гандлёвых кропак да ўсяго гэтага — агульнавядомыя... Дагледзець жа агульнанародную (назавём яе менавіта так з адпаведнай нацяжкай і па звычцы) гаспадарку нестае часу. Пісаць трэба! Цыркуляры, справаздачы, цыдулкі, рыхтаваць матэрыялы для выступленняў начальства, а часам бегаць тудысюды (гэта называецца "бег на месцы"), каб рабіць выгляд, што заняты нечым карысным і для ўстановы, і нават для дзяржавы.

У маім узросце ўжо не здзіўляе, што дзяржаўная сістэма кіравання, наладка яе механізмаў, а ў апошні час і з вельмі назойлівым ідэалагічным ухілам нагадвае веласіпед, сабраны з выпадковых дэталяў, знойдзеных на гарадской звалцы: нешта ад міні-трактара, нешта ад дзіцячай каляскі, штосьці ад прычапных плугоў і вечнай бараны. Паедзе не паедзе такі веласіпед — гэта не клопат канструктара ці зборшчыка. Галоўнае — вынік: агрэгат сабраны і нават з апярэджаннем устаноўленых тэрмінаў, вызначаных наверсе, дзе часам і не ўяўляюць, для чаго гэта і каму патрэбна і ці можна будзе збыць такое стварэнне каму-небудзь за хоць бы невялічкую суму інвестыцый у нашу эканоміку. Раней, у савецкія часы, пераважна на кухнях, такое называлі "бардаком", сёння — больш далікатна: адметным беларускім курсам рынкавага сацыялізму. Во, браточкі вы мае, закавыка якая, загагуліна! Адным словам, хрэн з рэдзькай!

Напампаваныя чыноўнікамі міністэрствы і ведамствы часам пачынаюць выдумляюць сабе работу, каб за выкананне (або невыкананне) адпісацца перад саноўнікамі са срэбнымі і залатымі аксельбантамі. То іх кідае ў сверб абагуліць галадранца з багатай гаспадаркай і атрымаць двух галадранцаў. Потым гэтых двух галадранцаў далучыць да багатага завода ці бізнесмена і атрымаць трох галадранцаў, а ў сельскай мясцовасці вырасціць адзін колас там, дзе некалі раслі два-тры, каб каровы давалі малака менш казінага, а свінячае пагалоўе лічыць не па кілаграмах, а паштучна. Гэта каб быў прыкметны рост і поспех вечнага савецкага эксперыменту. То пры дапамозе так званай "залатой акцыі", як ланцужком, прывязаць лепшыя прадпрыемствы, у тым ліку і прыватныя, да дзяржаўнай "будкі"...

А як разгуляюцца ад такіх поспехаў блохі ў штанах, то свербу няма канца і краю. А калі разбэсцяцца тыя блохі, што адказваюць за спорт, або тыя, чыя спецыфіка — фестывалі, дажынкі, першая сяўня, першы сноп або фестываль ветэранаў і пенсіянераў пад дэвізам: "З надзеяй у вясну!" (Не б прыдумаць нешта накшталт такога: "З добрай пенсіяй — да канца дзён сваіх!".) І ў рэшце рэшт грошыкі нашы, народныя, саноўныя чыноўнікі, як тыя купцы нападпітку, шпурляюць туды, куды захоча левая ці правая нага!

А тут нядаўна новую гульню вынайшлі: дзяржава Беларусь захацела стаць не эканамічна і тэхналагічна развітай, а касмічнай краінай! Во пацеха, браточкі! З голым задам, пакусаным блохамі, і са з'едзенымі моллю штанамі ды ў панскі рад! Лабісты, гэта тыя, хто прасоўвае гэтую ідэю праз Адміністрацыю прэзідэнта, урад, Нацыянальны сход, малююць такія выгоды ад мільярдных доларавых затрат, што аж блохі сціхаюць, натапырыўшы вушкі. Пэўне, і яны не здагадваюцца, што пасля такіх палётаў нават чыноўнікі застануцца без штаноў і бедныя насякомыя стануць беспрытульнымі...

Накарміць бы народ (напіцца ён і сам здолее!), запусціць не спадарожнікі ў космас, а аснову асноў нашага жыцця — эканоміку: заводы, фабрыкі, сельскую гаспадарку вывесці са стану жабрацтва, заняць людзей вытворчасцю добрай прадукцыі, перастаць гуляць з нагоды і без яе, пачухаць патыліцу, а не тое месца, дзе блохі любяць гуляць (вопыту ў свеце — бяры-надарвешся). Што, на гэта хіба розуму не хапае? Што, беларуская зямля, спустошаная калгасна-саўгаснай бальшавіцкай сістэмай, перастала нараджаць сваіх Сталыпіных, апроч шклоўскіх "прарокаў"? Ці Архімедаў замест малаадукаваных, нядзатных і баязлівых чыноўнікаў, якія змаглі б усё-такі вызначыць пункт апоры, каб развярнуць нашу эканоміку ў талковым накірунку і прасоўваць яе наперад так, як гэта робіцца ў нашых суседзяў?

А мы, быццам тыя рабы на галерах, прыкаваныя сваім векавым становішчам, і надалей будзем веславаць туды, куды, не заўсёды добра падумаўшы, скажа нам адзіны на ўсю краіну гаспадар і палітык?

Але ўсе гэтыя філасофска-эканамічна-сацыяльныя праблемы патрабуюць грунтоўнага даследавання хваробы не толькі шатаў, але і каранёў з боку навуковых інстытутаў, якія б не займаліся распрацоўкамі з адпаведным накірункам, а, абагульняючы вопыт лепшых эканамічна-развітых краін, маглі б прапанаваць сваю навукова-практычную мадэль выхаду Беларусі з ліку недаразвітых краін, а да дзяржаў, дзе жыццё здольнае зрабіць чалавека шчаслівым, адпаведна стымулюючы працу чалавека на стварэнне такога жыцця.

Таму я і звяртаюся да высокіх чыноўнікаў са срэбнымі і залатымі аксельбантамі: не дапамагае дуст, купіце за мяжой больш эфектыўныя сродкі і вытравіце гэтых шкодных насякомых, што не даюць магчымасці дзяржаве сканцэнтраваць увагу на самых важных і жыццёва неабходных праблемах. Можа, і выйдзе нарэшце што-небудзь талковае і вартае. А не ўмееце, не хапае шэрага рэчыва, смеласці і самастойнасці, то ідзіце вы...

Растуць этажы Нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску.

photo.bymedia.net

ЗАПРАШЭННЕ

«Вясна музеяў» у Мінску

Гэтую акцыю прыдумалі не ў нас, а ў Заходняй Еўропе. Яе мэта — актывізаваць цікавасць грамадства да музеяў як з'явы культуры, "зацягнуць" у музейныя залы як мага больш наведвальнікаў. Прычым нават тых, для каго мастацтва — не рэч першай неабходнасці, хто звычайна шкадуе на музей грошай альбо не мае часу. Робіцца гэта проста. У дзень пачатку акцыі уваход у музеі, якія бяруць у ёй удзел, бясплатны. Згадзіцеся, наведаць задарма, "на халяву" Луўр, фларэнтыйскую галерэю Уфіцы альбо Брытанскі музей зусім някепска. На тое і разлік. А там, глядзіш, зацікавіцца чалавек і ў наступны раз прыйдзе ў музей ужо самохаць.

Яшчэ да гэтай акцыі музеі рыхтуюць спецыяльныя выставы пад ужо традыцыйнай назваю "Гісторыя гісторыі". Гэтыя выставы мусяць распавядаць пра падзею, з'яву альбо асобу, не надта вядомыя шырокай грамадзе, але важныя для разумення гісторыі.

Сёлета ў "Вясне музеяў" бярэ ўдзел і наша краіна, два галоўныя музеі Беларусі — Нацыянальны мастацкі і Нацыянальны гісторыі і культуры. Як і чакалася, 2 траўня, у дзень пачатку акцыі, дзень бясплатнага наведвання, ля прыгаданых музеяў стаялі чэргі жадаючых далучыцца да мастацтва. У Нацыянальным мастацкім, акрамя пастаяннай экспазіцыі, наведвальнікі могуць зараз азнаёміцца з выставай праграмы "Вясны музеяў". Яна прысвечана архітэктару Міхаілу Бакланаву (1914—1990). Для супрацоўнікаў нашай галоўнай мастацкай скарбніцы М.Бакланаў амаль што родны. Бо будынак музея ўзведзены менавіта па ягоным праекце. Гэта, бадай, ягоная самая вядомая работа.

Нарадзіўся Бакланаў ва Украіне. Да вайны паспеў скончыць чатыры курсы Харкаўскага інжынерна-будаўнічага інстытута. На вайне быў паранены, трапіў у палон, уцёк з палону, партызаніў. У 1944—1948 гадах як архітэктар браў удзел у адбудове Мінска. Разам са славутым Лангбардам праектаваў кінатэатр "Перамога" і набярэжную Свіслачы. Ён аўтар праектаў жылых дамоў у цэнтральнай частцы Мінска, будынкаў для сістэмы адукацыі і аховы здароўя. Актыўна працаваў да пачатку 70-х. Да канца жыцця карыстаўся планіровачнымі канонамі часоў "сталінскага ампіру" і, мабыць, вельмі шкадаваў, што нельга аздобіць свае праекты мілым ягонаму сэрцу псеўдабарочным і псеўдакласічным дэкорам, які гэтаму "ампіру" пасуе. Усё жыццё Бакланаў баяўся зрабіць хоць крок за межы ўхваленага уладай (і з гэтай прычыны нібыта агульнапрынятага) канона. Гэта ўласціва многім людзям ягонага пакалення. Жыццё навучыла іх не выторквацца.

Калі пагадзіцца, што архітэктура — каменная музыка, дык творчую спадчыну прыгаданага дойліда можна параўнаць з мелодыяй для барабана і флейты. Пад яе хіба што маршыраваць па казарменным пляцы пад пільным вокам унтэр-афіцэра. Такая вось "гісторыя гісторыі" ў беларускай версіі "Вясны музеяў".

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

Зацуглялі...

Працоўныя кантракты ўлады выкарыстоўваюць як сродак кантролю над грамадствам...

Масавы перавод працоўных і служачых на працоўныя кантракты набыў апошнім часам масавы характар. Людзей цікавіць, ці могуць іх прымушаць пераходзіць на кантракты, ці могуць яны адмовіцца заключаць такі кантракт, якая працэдура падпісання кантракту і, нарэшце, чаму кантракты заключаюцца толькі на адзін год, а не на пяць гадоў, і ці не з'яўляецца прымусовы перавод на кантракты парушэннем працоўных правоў жыхароў краіны.

Трэба адзначыць, што тэмай кантрактаў я зацікавіўся невыпадкова. Чамусьці менавіта ў гэтым годзе пачаўся масавы, вельмі часта нічым не абгрунтаваны перавод працоўных і служачых краіны на кантрактную аснову. Прычым трэба адзначыць, што кантракты амаль ва ўсіх выпадках заключаюцца толькі на адзін год. У некаторых выпадках раней заключаныя кантракты тэрмінам на пяць год у гэтым годзе былі перазаключаныя на новы, гадавы тэрмін. Усё гэта нагадвае спланаваную і арганізаваную некім кампанію. Аднак дарэмнымі былі мае намаганні знайсці хаця б нейкі нарматыўна-прававы акт аб неабходнасці пераводу ўсіх працоўных краіны на гадавы кантракт. Такога дакумента проста няма. Усё як заўсёды адбываецца выключна "добраахвотна" і, як казалі ў савецкія часы, "па шматлікіх просьбах трудзяшчыхся". Насамрэч ініцыятыва пераводу на кантракты зыходзіць менавіта з Адміністрацыі прэзідэнта, якая праз сваю выканаўчую вертыкаль настойліва "рэкамендуе" адміністрацыям прадпрыемстваў і ўстаноў ажыццяўляць перавод сваіх супрацоўнікаў на гадавыя кантракты. Прычым робіцца ўсё гэта са спасылкай на цікавы "дакуменцік" — пратакол-даручэнне прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24.12.2004 № 49 па выніках пастаянна дзеючага семінара кіруючых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых органаў кіравання "Кадры кіравання ў сучасных умовах", які адбыўся 20—21.11.2003 г. На жаль, тэкста гэтага даручэння раздабыць так і не ўдалося, бо гэта не нарматыўна-прававы акт і ён у адпаведным дзяржаўным рэестры не зарэгістраваны. Любіць наш прэзідэнт апошнім часам выдаваць цікавыя дакументы, прававы статус якіх не зусім зразумелы — то дырэктыву напіша, то даручэнне.

Што такое кантракт

Права заключаць кантракты з працаўнікамі было нададзена наймальніку згодна з Дэкрэтам прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.06.1999 г. № 29 "Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, узмацненні працоўнай і выканаўчай дысцыпліны". Раней кантракты заключаліся з некаторымі катэгорыямі працаўнікоў (кіраўнікі прадпрыемстваў, асобы, якія маюць права на поўную пенсію, і інш).

Кантракты могуць заключацца як пры прыёме на працу, так і з працаўнікамі, якія працуюць па бестэрміновай працоўнай дамове. Пры гэтым трэба памятаць, што заключэнне кантракта павінна адбывацца ў сувязі з абаснаванымі вытворчымі, арганізацыйнымі ці эканамічнымі прычынамі, аб чым працаўнік павінен быць пісьмова папярэджаны за месяц. Заканадаўствам таксама ўстаноўлена, што кантракт як від тэрміновай працоўнай дамовы заключаецца ў выпадках, калі працоўныя адносіны не могуць быць устаноўлены на нявызначаны тэрмін з улікам характару працы ці ўмовамі яе выканання. Адпаведна няма ніякай працоўнай неабходнасці пераводзіць на кантракт токара ці фрэзероўшчыка на заводзе, настаўніцу ў школе ці прыбіральшчыцу, іншых працоўных і служачых, чыя праца, яе характар дазваляюць рэгуляваць працоўныя адносіны з наймальнікам на падставе бестэрміновай працоўнай дамовы. Але чаму зараз пераводы на кантракты набылі татальны характар, якія небяспекі ў сувязі з гэтым хаваюцца і што трэба ведаць, калі вас пераводзяць на кантракт? Для гэтага давайце спачатку разбяромся, што ж такое кантракт.

Кантракт — працоўная дамова, якая заключаецца ў пісьмовай форме на вызначаны ў ім тэрмін, які ўтрымлівае асаблівасці ў параўнанні з агульнымі нормамі заканадаўства аб працы і які прадугледжвае канкрэтную мінімальную кампенсацыю за пагаршэнне прававога стану працоўнага.

Што ж гэта за асаблівасці такія ўтрымлівае кантракт у параўнанні з агульнымі нормамі заканадаўства, у чым яны заключаюцца? А заключаюцца яны ў тым, што ў параўнанні з Працоўным кодэксам кантракт як від тэрміновага працоўнага дагавору прадугледжвае пагаршэнне прававога статусу працоўнага. Гэтае пагаршэнне заключаецца ў тым, што наймальнік мае права спыніць працоўныя адносіны з працаўніком па заканчэнні тэрміну дзеяння кантракта без усялякіх тлумачэнняў і ўказання дадатковых умоваў, а працоўны не можа звольніцца па асабістым жаданні на працягу ўсяго тэрміну дзеяння кантракта. Ёсць толькі некалькі падстаў для спынення дзеяння кантракта па патрабаванні працаўніка да заканчэння тэрміну, на які ён заключаны (датэрмінова). Гэтыя абставіны выкладзеныя ў арт. 41 ПК Рэспублікі Беларусь (хвароба альбо інваліднасць, якая перашкаджае выкананню працы па працоўным дагаворы, а таксама парушэнне наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнай дамове альбо працоўнай дамове, пры гэтым гэтыя парушэнні мусяць быць устаноўлены адмыслова ўпаўнаважаным дзяржаўным органам нагляду за выкананнем заканадаўства аб працы, прафсаюзамі ці судом). Кантракт можа быць датэрмінова скасаваны таксама па згодзе бакоў.

Мінімальны тэрмін кантракта — адзін год, а максімальны — пяць гадоў. Канкрэтныя тэрміны дзеяння кантракта вызначаюцца пагадненнем бакоў. Але на практыцы гэта значыць, што тэрміны вызначае наймальнік. Не хочаш падпісваць, не падпісвай і звальняйся.

Як бачым, пагаршэнне ўмоваў працаўніка вельмі істотныя, наймальнік можа звольніць яго як падчас дзеяння кантракта (па віноўных абставінах, пазначаных у ПК і ў самім кантракце), так і пасля яго заканчэння. Пры гэтым ніякіх кампенсацый па звальненні ў сувязі з заканчэннем кантракта не прадугледжваецца. Адзіны выпадак, калі працаўніку выплачваецца кампенсацыя ў памеры трох сярэднямесячных зарплат, — гэта ў выпадку датэрміновага скасавання кантракта ў сувязі з невыкананнем яго ўмоваў па віне наймальніка. (Згодна з п.2 Пастановы Савета міністраў "Аб зацвярджэнні прыкладнай формы кантракта наймальніка з працаўніком" ад 2.08.1999 г. № 1180.) Прычым гэты пункт не распаўсюджваецца на асобаў, што дасягнулі пенсійнага ўзросту.

Можна толькі ўявіць, наколькі гэта зручная для наймальніка, ды і для ўладаў наогул, сістэма. Зараз можна звольніць любога няўгоднага супрацоўніка, і зрабіць гэта вельмі проста — не працягнуць яму кантракт на наступны год. Усё законна, і ніякіх тлумачэнняў не патрэбна. Ніякі суд не адновіць, а ПК з ягонымі гарантыямі можна выкінуць у сметнік. Цяпер можна спакойна расправіцца і з прафсаюзным "крыкуном", і з апазіцыйным "адмарозкам", і проста з непрыемным для начальства чалавекам, які шмат правоў "качае" ці проста не падабаецца. Фактычна ствараецца сістэма ўсеагульнага кантролю.

Трэба адзначыць, што ад пераводу на кантракты церпяць і такія катэгорыі працоўных, як цяжарныя жанчыны і жанчыны, што маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, адзінокія маці, што маюць дзяцей ад трох да чатырнаццаці гадоў (дзяцей-інвалідаў да 18 год), бо гарантыі для дадзеных катэгорый працоўных, прадугледжаныя ч.3 арт. 268 ПК, распаўсюджваюцца на іх толькі на час дзеяння кантракта. Пасля яго заканчэння наймальнік мае права не працягваць працоўныя адносіны з гэтай катэгорыяй жанчын на новы тэрмін. А ці будзе захоўвацца за жанчынай, што знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку ці адпачынку ў сувязі з доглядам за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў, яе працоўнае месца, калі тэрмін дзеяння яе кантракта толькі адзін год? Не будзе, бо па заканчэнні тэрміну кантракта заканчваюцца і працоўныя адносіны з жанчынай, якая знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку. Вось вам і клопат пра будучыню нацыі і сацыяльна арыентаваная краіна. Калі раней жанчына, якая збіралася стаць маці, была ўпэўненая, што пасля дэкрэтнага адпачынку за ёй застанецца яе працоўнае месца, зараз такіх гарантый у яе няма. Скончыўся кантракт— шукай працу нанова. Такая сітуацыя можа прывесці проста да працоўнай дыскрымінацыі жанчын, бо наймальнікі не захочуць працягваць кантракты з жанчынамі. Яны то нараджаюць, то ў іх дзеці хварэюць, якія з іх работнікі. Раней яны не маглі звольніць "проста так", а зараз — элементарна.

Вось такія пагаршэнні, а што ж узамен? А ўзамен кантракт павінен прадугледжваць дадатковыя ўмовы стымулявання працы (згодна з п. 2.5. Дэкрэта) сярод якіх:

— прадстаўленне дадатковага заахвочвальнага адпачынку з захаваннем сярэдняй заработнай платы да пяці каляндарных дзён;

— павышэнне тарыфнай стаўкі (не больш як на 50%, калі большы памер не прадугледжаны заканадаўствам).

Трэба адзначыць, што наймальнікі вельмі "ашчадна" ставяцца да гэтых дадатковых умоваў стымулявання працы: даюць адзін дзень да адпачынку і 1% да заробку. Вельмі часта наймальнікі наогул не ўключаюць у кантракт ніякіх дадатковых умоваў, спасылаючыся на адсутнасць грошай. У такім выпадку кантракт супярэчыць патрабаванням дзеючага заканадаўства і ў першую чаргу палажэнням самога Дэкрэта № 29. Вельмі часта ў кантрактах адсутнічаюць пункты аб тым, што на супрацоўніка распаўсюджваюцца палажэнні заключанай калектыўнай дамовы паміж прафсаюзнай арганізацыяй, сябрам якой з'яўляецца працаўнік, і наймальнікам.

Што рабіць, калі вам прапанавалі перайсці на кантракт

Як я ўжо казаў раней, наймальнік мае права прапанаваць перайсці на кантракт не толькі нанова прынятаму на працу працаўніку, але і таму, хто ўжо працуе на падставе бестэрміновай працоўнай дамовы. Што рабіць і што трэба ведаць, калі вам прапанавалі перайсці на кантракт? Па-першае, вы павінны памятаць, што аб намеры перавесці вас на кантракт наймальнік павінен пісьмова паведаміць вам за месяц да пераводу на кантракт. Паведаміць менавіта ў пісьмовай форме. За месяц да пераводу на кантракт вам павінны прадаставіць пісьмовае ўведамленне аб намеры заключыць з вамі кантракт на год, у якім вы маеце права паставіць подпіс і дату ўручэння паведамлення. У тэксце паведамлення мусіць быць указаны тэрмін пачатку месячнага папярэджання і яго заканчэння, а таксама інфармацыя аб тым, што ў выпадку адмовы ад пераходу на кантракт вы будзеце звольненыя па п.5 арт. 35 ПК Рэспублікі Беларусь (адмова працягваць працу ў сувязі са зменамі істотных умоваў працы). Паведамленне павінна мець рэгістрацыйны нумар і подпіс, пячатку. Адзін экзэмпляр паведамлення павінен захоўвацца ў вас на руках, другі ў канцылярыі наймальніка. Невыкананне наймальнікам гэтых працэдур можа пацягнуць прызнанне пераводу на кантракт не адпавядаючым патрабаванням заканадаўства. Памятайце, што перавод на кантракт павінен быць матываваны. Нельга пераводзіць на кантракт толькі таму, што ў краіне адбываецца кампанія пад назвай "Даеш кантракт!" У п.20 Пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 29.03.2001 № 2 "Аб некаторых пытаннях выкарыстання судамі заканадаўства аб працы" даецца растлумачэнне, што маецца на ўвазе пад тэрмінам працоўнай і вытворчай неабходнасці. Згодна з п.2 Пастановы, "змены істотных умоваў працы павінны быць матываваны вытворчымі, арганізацыйнымі ці эканамічнымі прычынамі, якія выражаюцца, у прыватнасці, у рацыяналізацыі працоўных месцаў, зменах тэхнікі і тэхналогіі вытворчасці, увядзенні новых формаў арганізацыі працы, удасканаленні працоўных месцаў на падставе атэстацыі". Зразумела, што для наймальніка не складае вялікіх цяжкасцяў сказаць, што ён пераводзіць вас на кантракт у сувязі з рацыяналізацыяй вашага працоўнага месца, але ў шэрагу выпадкаў гэта проста немагчыма. Як патлумачыць неабходнасць пераводу на кантракт выхавацелькі ў дзіцячым садку, ці прыбіральшчыцы, ці нават рабочага завода? У большасці выпадкаў патрабаванні матываванасці пераводу на кантракт наогул ігнаруюцца наймальнікам. І дарма, бо, згодна з арт. 35 ПК Рэспублікі Беларусь, адсутнасць доказаў, якія пацвярджаюць абаснаваныя вытворчыя, арганізацыйныя ці эканамічныя прычыны пераводу на кантракт робяць далейшае звальненне па п.5 арт. 35 ПК Рэспублікі Беларусь незаконным.

Пасля таго як вы атрымалі паведамленне, у вас ёсць два варыянты: даць згоду на перавод на кантракт ці адмовіцца. У выпадку адмаўлення ад пераводу на кантракт вы будзеце звольненыя па п.5 арт. 35 ПК Рэспублікі Беларусь. Звальненне па гэтым артыкуле прадугледжвае выплату двухтыднёвай выхадной дапамогі, але не прадугледжвае захавання гарантый для некаторых катэгорый працаўнікоў, прадугледжаных нормамі ПК Рэспублікі Беларусь: гарантыі для цяжарных жанчын і жанчын, што маюць непаўналетніх дзяцей; працаўнікоў, маладзейшых за 18 год; гарантыі прафсаюзных працаўнікоў. Справа ў тым, што звальненне па гэтым артыкуле не з'яўляецца звальненнем па ініцыятыве наймальніка.

У выпадку, калі вы ўсё ж такі вырашылі падпісаць кантракт, вы мусіце ведаць, што пункты кантракта павінны быць узгодненыя паміж вамі і наймальнікам, у тым ліку і тэрмін, на які ён заключаецца. Таксама кантракт павінен утрымліваць дадатковыя меры стымулявання працы (дадатковы адпачынак да 5 дзён з захаваннем заробку і інш.). Не дапускаецца заключэнне кантракта тэрмінам менш як на адзін год. Звальненне працаўніка па заканчэнні кантракта, заключанага тэрмінам менш як на адзін год, будзе прызнанае судом як незаконнае, і працаўнік будзе адноўлены на працы з выплатай кампенсацыі за вымушаны прагул і кампенсацыяй маральных стратаў у адпаведнасці з нормамі ПК Рэспублікі Беларусь. Вельмі часта такія кантракты заключаюць з асобамі перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту. Ні Дэкрэт №29, ні іншыя нарматыўныя акты не прадугледжваюць такога права. Мінімальны тэрмін у адзін год устаноўлены для ўсіх катэгорый працоўных без выключэння. Згодна з п.5 Палажэння аб парадку і ўмовах заключэння кантрактаў наймальнікамі з працаўнікамі (зацверджана Пастановай Савета міністраў Рэспублікі Беларусь 25.09.1999 г. №1476), канкрэтны тэрмін кантракта вызначаецца па згодзе бакоў. Зыходзячы з гэтага, пасля таго як вы атрымалі ўведамленне аб пераводзе вас на кантракт, вы можаце напісаць заяву на імя кіраўніка прадпрыемства аб тым, што вы не супраць перайсці на яго, але хочаце ведаць, чым такі перавод матываваны, і просіце тэрміны, дадатковыя сацыяльна-бытавыя льготы (п.11 Палажэння) узгадніць з вамі. Заяву абавязкова зарэгіструйце у канцылярыі, другі асобнік пакіньце ў сябе. Лепш, калі такія ж заявы напішуць усе вашы калегі па аддзеле, цэху, іншай арганізацыйнай структуры. Разам вам будзе прасцей аказваць ціск на адміністрацыю прадпрыемства, патрабуючы заключыць кантракт з вамі не на адзін год, а на пяць гадоў, уключыць у яго патрабаванні аб распаўсюджванні на вас умоваў калектыўнай дамовы і г.д. Наймальнік не зможа звольніць вас па п.5 арт. 35 ПК, паколькі вы пісьмова праінфармавалі яго аб згодзе працягваць працоўныя адносіны па кантракце.

Яшчэ адна акалічнасць, якую трэба ведаць. Калі з вамі раней ужо быў заключаны кантракт, яго перазаключэнне на новы тэрмін, яго працяг, змены ўмоваў кантракта адбываюцца толькі па згодзе бакоў у адпаведнасці з заканадаўствам (п.12 Палажэння).

Напрыканцы я б хацеў сказаць, што, безумоўна, перавод усіх працоўных на кантракты з'яўляецца парушэннем працоўных правоў. Практыка выкарыстання Дэкрэта № 29 сведчыць пра тое, што наймальнікі вельмі часта ігнаруюць патрабаванні заканадаўства пры ажыццяўленні такіх пераводаў. Але самае горшае ў гэтай сітуацыі, што чалавек пры заключэнні такога кантракта робіцца безабаронным, залежным ад адміністрацыі прадпрыемства. Пры практычнай адсутнасці незалежных прафсаюзаў у краіне няма каму стаць на абарону правоў працоўных, акрамя саміх працоўных. Праз кантракты ўлады ствараюць зручную сістэму кантролю над грамадствам. На жаль, у Беларусь зноў вяртаецца сістэма усюдыснага кантролю над грамадзянамі, такая знаёмая нам з часоў СССР. Людзей зноў прымушаюць маўчаць, баяцца і хлусіць. Адзіная дзяржаўная ідэалогія, кантроль над студэнтамі і моладдзю праз адзіную праўрадавую арганізацыю, кантракты па месцы працы — усё гэта звенні аднаго ланцуга.

Валянцін СТЭФАНОВІЧ, юрыст.

ЧТО ПРОИСХОДИТ В МИРЕ

НОВОСТИ

«Квартет» подтвердил приверженность «дорожной карте»

В Нью-Йорке завершилась встреча международного "квартета" спонсоров "дорожной карты" — плана ближневосточного урегулирования.

Участники подтвердили свою приверженность формуле двух государств — Израиля и Палестины. Генеральный секретарь ООН Кофи Аннан призвал Израиль и палестинцев предпринять шаги к выполнению всех обязательств в рамках мирного процесса. По его словам, члены "квартета" разделяют серьезные опасения по поводу ситуации на Ближнем Востоке. Он призвал власти Палестинской автономии активно действовать против боевиков, а Израиль — прилагать все усилия к тому, чтобы избегать потерь среди мирных жителей.

Во встрече, которая проходила под председательством Аннана, приняли участие госсекретарь США Колин Пауэлл, министр иностранных дел России Сергей Лавров и координатор ЕС по внешней политике Хавьер Солана.

Три мощных взрыва в центре Афин

Три мощных взрыва прогремели рядом с полицейским участком в центре Афин. По словам представителей полиции, незадолго до взрывов в одну из греческих газет позвонил неизвестный и предупредил о готовящейся акции.

Началось расследование инцидента, в котором принимает участие антитеррористическое подразделение греческой полиции. Инцидент произошел ровно за 100 дней до начала Олимпийских игр, которые проводятся в Греции.

Великий день Европы

Расширение Европейского Союза ознаменовалось сносом многих пограничных столбов и яркими торжествами в столицах. Европа стала шире, больше. ЕС вырос с 15 до 25 стран, территория его увеличилась на четверть, объем экономики — на 5%, оставляя позади США, население — на 20% до 450 млн. человек. Новый ЕС становится самым большим по населению единым рынком в мире и отстает лишь от НАФТА (Североамериканской зоны свободной торговли, объединяющей США, Канаду и Мексику) по объемам экономики.

Почему это произошло и каковы перспективы нового образования?

Зачем Европа расширяется?

Сторонники расширения говорят, что вступление в Единую Европу новых членов — историческая возможность объединить Европу мирным путем после столетий войн и вражды. Они полагают, что расширение Европы позволит распространить стабильность и процветание нынешнего ЕС на другие страны континента, сделав Европу более безопасной. Размеры единого рынка позволят, по их мнению, не только создать новые места и ускорить экономический рост, но и дадут Европе большие рычаги влияния на мировой арене.

До сих пор перспектива вступления в ЕС была для стран-кандидатов своего рода пряником, подталкивая их к проведению смелых экономических и социальных реформ.

В ходе реформ эти страны (особенно бывшие коммунистические) привлекли огромные объемы иностранных инвестиций и достигли высоких показателей экономического роста, что многие экономисты называют их "европейскими тиграми" — по аналогии с "азиатскими тиграми" Юго-Восточной Азии.

Что получат новые страны от вступления в ЕС?

В первые три года из бюджета ЕС на новые страны будет тратиться 40 млрд. евро ежегодно. При этом сами новые члены должны отдавать в бюджет единой Европы 15 млрд. евро. Так что, "старой" Европе "новая" обойдется в 25 млрд. евро ежегодно.

По ряду оценок общая стоимость расширения ЕС с 2000 по 2006 год составит около 67 млрд. евро. По оценкам инвестиционных банков, Восточная и Центральная Европа на ближайшие 10 лет останется одним из самых быстрорастущих регионов.

В выигрыше окажутся не только граждане этих стран, но и их восточные соседи.

Экономический рост региона приведет к росту спроса на энергоносители, а значит — на российские нефть и газ. Богатеющие поляки и словаки, как 10 лет назад немцы, смогут искать в приграничных областях Украины дешевое медобслуживание, отдых и товары.

Будет ли расширяться дальше?

После расширения 2004 года, самого массового за всю историю, кандидатами на вступление остаются Болгария, Румыния и Турция. Первые две страны готовы вступить в ЕС в 2007 году. Но Турция еще не начала переговоры о вступлении — ее судьба будет решаться только в 2005 году. Македония и Хорватия также подали заявки на вступление. По мере решения политических и экономических проблем Брюссель готов рассматривать вопрос о членстве Боснии и Сербии.

Никаких решений о возможном вступлении Молдавии или Украины, провозгласивших присоединение к ЕС долгосрочной целью совей политики, пока нет и, судя по всему, в ближайшее время не будет. В своем комментарии "Немецкая волна" замечает, что о возможности вступления в ЕС таких стран, как Беларусь, Украина, Азербайджан, Армения, пока рано даже говорить. Но этим странам необходимо предложить особое партнерство. Евросоюз должен так выстраивать свои отношения с соседями на Востоке и на Юге, чтобы они видели, какого успеха можно добиться, опираясь на принципы интеграции, демократии, правового государства и рыночного хозяйства.

К вступлению готовы две богатейшие страны Европы — Норвегия и Швейцария. Но там эта идея не находит поддержки большинства населения.

Послы стран Евросоюза в Минске на торжественной церемонии поднятия флага Европейского содружества.

photo.bymedia.net

В зеркале прессы

Под заголовком "Добро пожаловать в Европу!" германская "Вельт" пишет о том, что вступление в Евросоюз 10 новых членов является поводом для торжества. По мнению газеты, важность этого события состоит не в количестве человек или в расширении географических границ ЕС. "Прежде всего, это означает, что мы преодолеваем разделение Европы окончательно и бесповоротно, и это самое главное".

В своем комментарии "Немецкая волна" замечает: после века мировых войн, исходивших с немецкой земли, после периодов фашистских и коммунистических диктатур наконец-то удалось преодолеть раздел континента. Впервые за всю историю Европы почти все страны континента добровольно заключили союз, равного которому нет во всем мире.

Подготовил к печати Иван МАКАЛОВИЧ.

Взгляд через фотообъектив

Мать иракца, арестованного войсками США, ждет у тюрьмы Абу-Грайб известий о судьбе своего сына.

Овца Шрек, давшая больше 20 кг шерсти, удостоена "аудиенции" у премьер-министра Новой Зеландии.

На реке Кшипра, в Индии, завершилось многодневное омовение паломников, происходящее только раз в 12 лет.

Новым главой МВФ стал Родриго Рато

Международный валютный фонд (МВФ) официально объявил о том, что новым директором-распорядителем организации назначен бывший министр финансов Испании Родриго Рато.

Как отмечают обозреватели, Рато внес большой вклад в значительное улучшение экономического положения страны.

Рато заменит на посту главы МВФ Хорста Келера, который подал в отставку, чтобы принять участие в выборах президента Германии. Назначение Рато продолжило традицию, согласно которой пост директора-распорядителя МВФ занимает представитель европейской страны. В то же время во главе Всемирного банка обычно стоит американец.

Сейм Литвы принял поправку против Паксаса

Сейм Литвы большинством голосов принял поправку в Закон о выборах президента, поставившую под сомнение дальнейшее участие Роландаса Паксаса в качестве кандидата на кресло главы государства. Она запрещает баллотироваться повторно тем, кто был отстранен от власти путем импичмента. Впрочем, Конституционному суду страны еще предстоит решить, не противоречит ли эта поправка Конституции Литвы.

ИДЕИ И ПРОЕКТЫ

Из Лондона в Нью-Йорк по дну океана

Теперь, когда прекратились полеты сверхзвуковых самолетов "Конкорд", меньше чем за пять часов из Англии до Америки добраться невозможно. Но если будет осуществлена необычная идея двух американских ученых, то на это будет уходить всего лишь один час.

Эрнст Френкель, сотрудник группы, которая первой начала разработку проекта туннеля под Ла-Маншем, и профессор технологии морских сооружений Массачусетского университета Фрэнк Девидсон предложили соединить Старый и Новый свет подводным туннелем, по которому со скоростью почти шесть с половиной тысяч километров в час будут ходить поезда на магнитной подушке.

Туннель, погруженный под воду на глубину от 450 до 600 метров, предполагается собрать из отдельных секций гигантских труб, которые будут изготовляться в сухом доке, а затем транспортироваться на баржах к месту погружения, где из них полностью откачают воздух. Собранный туннель будет висеть на тросах, прикрепленных к массивным опорам, чтобы исключить возможность смещения труб под воздействием течений.

Одна из предложенных трасс движения поездов проходит по поверхности земли от Нью-Йорка через территорию Северной Америки и Канады, а после этого по дну Атлантического океана, поднимаясь на поверхность Гренландии и Исландии. Затем она снова ныряет под воду, выходя наружу уже на территории Британии и достигая Лондона. Такой путь длиннее, но зато намного дешевле, чем трасса по прямой от Нью-Йорка до Лондона.

Насколько же осуществим проект подводного туннеля? Эрнст Френкель считает, что с инженерной точки зрения серьезных препятствий для этого нет. Но если с инженерной точки зрения препятствий нет, то с финансовой они достаточно велики. В самом деле, стоимость всего одного километра туннеля составит от 20 до 40 миллионов долларов, и найти спонсоров проекта будет не просто. Еще одна проблема — это безопасность движения, которую еще необходимо определить.

ЛЮБОПЫТНО

Британские стоматологи научились выращивать зубы

Британские ученые готовятся произвести сенсацию в стоматологии. Медики из Лондонского королевского колледжа приступили к клиническим испытаниям методики по выращиванию зубов из стволовых клеток, сообщает телекомпания НТВ.

Революционный метод позволит людям обходиться без зубных протезов — на месте удаленного зуба можно будет вырастить полноценную замену. Для этого пациенту придется пройти относительно простую процедуру.

Сначала из его костного мозга извлекут группу стволовых клеток, которые нередко называют "человеческой глиной" или "строительным материалом организма": именно из этих универсальных клеток развиваются все внутренние органы и ткани.

При помощи лабораторной стимуляции британские медики уже научились выращивать из стволовых клеток костную ткань — зародыш зуба. Этот зародыш следует вживить в десну, и за два месяца новый зуб пустит корни и прорежется.

Пока это теория, подкрепленная успешными экспериментами на мышах. На продолжение исследований ученые получили 400 тысяч фунтов стерлингов от Британского национального фонда науки и техники. По мнению специалистов, клинические испытания по выращиванию зубов могут продлиться около двух лет.

Будет ли секс на Марсе?

К традиционному вопросу "Есть ли жизнь на Марсе?" добавился еще один — "Будет ли там секс?". Как пишет газета "Independent", американцы полагают, что во время трехлетнего полета на Красную планету у космонавтов так или иначе могут возникнуть естественные потребности.

Тем более что в экипаж скорее всего войдут не только мужчины, но и женщины. Возможность "интима в невесомости" весьма смущает сотрудников аэрокосмического агентства. Романтические отношения на борту могут разобщить коллектив и даже вызвать ревность других участников марсианской миссии.

Для того чтобы избежать на корабле сценария "Отелло", NASA продумало несколько вариантов. Один из них — химическая стерилизация космонавтов и регулярное добавление в их пищу брома. Другой выход — послать к звездам тех, кому "за пятьдесят". В таком солидном возрасте, считают в NASA, астронавты будут вести себя более ответственно.

Коробка из-под печенья за 750 долларов

Круглая жестяная коробка из-под печенья продана на аукционе в Британии за 750 долларов. На первый взгляд в ней нет ничего необычного, но если присмотреться повнимательнее, можно обнаружить несколько непристойностей.

Автор идиллической художественной композиции в эдвардианском стиле пририсовал к традиционной сцене английского чаепития обнаженную парочку, занимающуюся любовью на цветочной клумбе, и двух спаривающихся собачек. В довершение ко всему он написал слово "дерьмо" (правда, очень мелкими буквами) на банке с джемом, красующейся на столе. Как оказалось, таким хитрым способом художник решил отомстить компании "Хантли и Палмер", производящей печенье, за то, что она уволила его без выходного пособия. "Этот работник был мастером, которого выгнали с работы и не дали какой-либо помощи, — говорит Ричард Голд — сотрудник фирмы, проводящей аукцион. — Тогда он, наверное, и подумал: "Они у меня попляшут".

Пририсованные сценки были случайно обнаружены бакалейщиком, который от нечего делать стал внимательно разглядывать коробку с печеньем. Когда супермаркет TESCO, для которого сделано печенье, обнаружил оригинальные детали, он отказался от своего заказа на 5 тыс. коробок.

ШОУ

«Ламбарджыні» да Мінска не даехаў

У сталічным футбольным манежы працуе IV Міжнародны аўтасалон «Мотаршоу-2004»

Футбольны манеж на праспекце Машэрава, дзе сёлета праходзіць штогадовая аўтамабільная выстава, — найбуйнейшае ў краіне памяшканне пад дахам, плошча якога складае 12 тысяч квадратных метраў. Гэта амаль у два з паловай разы перавышае плошчу спартыўнага комплексу ва Уруччы, дзе падобнае мерапрыемства было арганізавана летась.

Паводле звестак арганізатараў, зараз на "Мотаршоу" выстаўлена каля 20 аўтамабільных марак, у тым ліку сусветнавядомыя — "Мерседэс", "БМВ", "Фольксваген", "Опель", "Пежо", "Рэно", "Форд", "Хонда", "Нісан", "Вольво" і іншыя. Знайшлі сваё месца на выставе і расійскія "ГАЗ", "ВАЗ" і "Іж". Амаль на кожным дылерскім стэндзе прэзентуюцца навінкі. Аматары "прокатиться с ветерком" могуць памацаць і нават пасядзець за рулём фантастычнага родстэра "БМВ-Z4", шыкоўнага кабрыялета "БМВ" 6-й серыі альбо звышшыкоўнага аўтамабіля бізнес-класа "БМВ-745і" коштам 66 тысяч еўра. "Фольксваген" прадставіў пяты мадэльны рад свайго самага папулярнага легкавіка "Гольф", на стэндзе "Мерседэс-Бэнц" элегантны родстэр SLK. Аматараў маркі "Опель" прывабіць дэбютант Франкфурцкага аўтасалона — новы "Опель Астра". Не ўпаў тварам у бруд і расійскі "ВАЗ" — прадставіў на "Мотаршоу" прынцыпіяльна новы прадукт звыклых для нас "жыгулёнкаў" — аўтамабіль "Лада Каліна"...

Нягледзячы на бравурны тон прамоў арганізатараў аўтасалона, асабліва што тычыцца перспектыў развіцця рынку новых імпартных аўтамабіляў у Беларусі, некаторыя замежныя аўтавытворцы адмовіліся прыслаць у Мінск свае творы. І таму мінчане іх на аўташоу ў футбольным манежы не пабачаць. Не прыехалі ў Мінск "Аўдзі", "Сітраен", "Міцубішы", "Таёта", "Сааб", "Лексус", "Поршэ" і іншыя гранды сусветнага аўтамабільнага бізнесу.

Як адзначыў **Дзмітрый Ярота,** генеральны дырэктар рэкламнага агенцтва "РэМарк", арганізатара аўтасалона, *"не ўдалося забяспечыць прыезд шыкоўнага італьянскага аўтамабіля "Ламбарджыні", які ўсталяваў тры сусветныя рэкорды хуткасці для серыйных аўтамабіляў".* Спачатку агенцтва вяло перамовы з Літвой, потым з Германіяй. Прычым Германія выстаўляла першапачаткова нявыгадныя ўмовы — арганізатары павінны былі перакрыць закладны кошт легкавіка (а гэта некалькі соцень тысяч долараў) на рахунак нямецкага дылера. Але здзелка не адбылася. Галоўная прычына — нядаўняе ўступленне ў Еўрасаюз Польшчы і Літвы, праз тэрыторыю якіх машыну можна было б даставіць у Беларусь транзітам. Правілы мытнага афармлення змяніліся, і таму "ракета на колах" у Мінск не даехала.

На "Мотаршоу-2004" прыемна здзіўляе арыгінальнасць некаторых аўтадылераў, якія ўсялякімі шляхамі спрабуюць прывабіць разявак да свайго стэнду. Напрыклад, японская "Хонда" запускае ў народ апранутых у нацыянальныя японскія сукенкі маленькіх дзяўчынак, якія прэзентуюць кожнаму наведвальніку жывую галінку квітнеючай сакуры. А той жа японскі "Нісан" амаль кожную гадзіну выпускае да сваіх легкавікоў мужчыну, вельмі падобнага на Верку Сярдзючку, які разам са спевамі пра тое, што "все будет хорошо, я это знаю", прапануе дзіўную экскурсію па новых мадэлях японскага канцэрна.

"Рэно" і "Мерседэс", наадварот, у прызначаны час замест абяцанай у плане прэзентацыі прапанавалі выключную маўклівасць сваіх супрацоўнікаў і здзіўленыя позіркі ў адказ на такія ж здзіўленыя позіркі наведвальнікаў выставы: "Ну што, будзем мы што-небудзь пачынаць ці не?"

Таксама непрыемна здзівіла відавочная скнарлівасць арганізатараў шоу. Аўтару гэтых радкоў прыйшлося літаральна з боем адваёўваць звычайны пакецік для складвання ў яго рэкламных праспектаў фірм-вытворцаў. Пакецікі, аказваецца, выдаваліся толькі тым, хто набыў квіток. Той жа самай катэгорыі наведвальнікаў шоу быў прызначаны на ўваходзе і бакал шампанскага, журналісты ў гэты пункт расходаў не ўваходзілі (калі б хтосьці з пары дзесяткаў журналістаў, акрэдытаваных на шоу, і пачаставаўся келіхам шампанскага, арганізатары б ад гэтага не збанкрутавалі).

Першы ж дзень аўтасалона завяршыўся для карэспандэнта "Народнай волі" яшчэ адным непрыемным сюрпрызам — пазбаўленнем акрэдытацыі. А здарылася вось што. Пасля дзвюх гадзін збору матэрыялаў я тэрмінова накіраваўся ў рэдакцыю, каб падрыхтаваць гэты артыкульчык. Па дарозе сустрэў свайго маладога калегу, які таксама хацеў пабываць на шоу, але не паспеў акрэдытавацца. "Схадзі па маім квітку, — ветліва пахлопваючы яго па плячы, я працягнуў яму сваё акрэдытацыйнае пасведчанне. Потым высветлілася, што хлопца на выставу не пусцілі, а мяне акрэдытацыі пазбавілі. Аказваецца, на думку арганізатараў, "выпускаць на поле замену" — гэта цяжкі грэх, за які трэба "строга караць". Адразу ж узгадаліся мае замежныя ваяжы: у любой краіне свету па звычайным журналісцкім пасведчанні мяне бясплатна пускалі ў любы музей, на любую выставу... Відаць, занадта шмат грошай, якія трэба вяртаць, інвеставана ў гэты аўтасалон у Мінску — "крок управа, крок улева — расстрэл"...

Дарэчы, пра кошт квіткоў на аўтасалон "Мотаршоу—2004". Яны зусім не танныя. З сённяшняга дня на аўтасалоне пачынаюцца так званыя народныя дні — кожны за **15 тысяч рублёў** можа азнаёміцца з сусветнымі аўташэдэўрамі, дзіця — за **5 тысяч рублёў**. Учора і пазаўчора былі VIP-дні: білет каштаваў ажно **50 тысяч рублёў.** Як паведамілі арганізатары, гэтыя VIP-дні былі прыдуманы, каб *"абмежаваць натоўп народу ў першыя выставачныя дні".*

6 і 7 мая выстава будзе працаваць да 21 гадзіны, у выходныя дні — 8 і 9 мая — да 19-й.

Алесь СІЛІЧ.

P.S. *Больш падрабязная інфармацыя пра "Мотаршоу-2004" будзе размешчана на чарговай старонцы "У дарогу", якая выйдзе ў "Народнай волі" ў гэтым месяцы.*





На здымках: *інспектар ДАІ дэманструе хлопчыку цуда-матацыкл; экспазіцыя "Пежо".*

photo.bymedia.net

СПОРТ

«Рэактар» не выбухне, але разагрэецца добра

Сёння ў 18.30 у сталічным клубе "Рэактар" пад дэвізам "Накаўт наркотыкам!" пройдуць баксёрскія баі сярод прафесіяналаў.

Па словах прэзідэнта Асацыяцыі прафесіянальнага бокса **Эдуарда Дубоўскага**, *"на рынг выйдуць спартсмены, якія толькі робяць першыя крокі ў сваёй прафесіянальнай баксёрскай кар'еры, але за якімі будучае".*

Так, напрыклад, Аляксандр Шніп, які прыме ўдзел у гэтым турніры, прафесіянальна займаецца ўсяго два з паловай гады. Не так даўно ён першым з беларускіх баксёраў змагаўся на рынгу ў Данецку за званне інтэркантынентальнага чэмпіёна па версіі IBF. Калі б Саша той бой выйграў (а ён, на жаль, прайграў яго ўкраінцу Вячаславу Сенчанку), то наступны паядынак праводзіў бы са славутым Канстанцінам Цзю.

Усяго сёння ў "Рэактары" пройдзе 9 баёў, а праводзіцца турнір клубам прафесіянальнага бокса імя Яўгена Бакумоўскага "Крыніца".

Каліна — не дрэва, а прынцыповы чалавек

Вызначыўся першы фіналіст Лігі чэмпіёнаў па футболе. Пасля перамогі ў другім матчы ў гасцях над іспанскім "Дэпарціва" — 1:0 (першая гульня — 0:0) у фінал выйшаў партугальскі "Порту".

Усё вырашылася на пачатку 2-га тайма, калі футбаліст іспанскага клуба Сесар "скасіў" Дэку каля лініі штрафной пляцоўкі. Многія арбітры ў такіх адказных матчах не рашаюцца даць спрэчны пенальці, аднак Каліна, вядомы на ўвесь футбольны свет сваёй бездакорнай лысінай і прынцыповым характарам, без роздуму паказаў на 11-метровую адзнаку. Удар Дэрлея, як аказалася, усё і вырашыў...

Нагадаем, што ў мінулым годзе "Порту" выйграў Кубак УЕФА.



Варатар "Порту" Вітор Байя ў экстазе ад выхаду ў фінал.

На чарзе — бронзавы прызёр чэмпіяната свету

Асацыяцыя "Беларуская федэрацыя футбола" дала згоду на прапанову турэцкіх калег аб правядзенні таварыскага матча нацыянальных зборных.

Гульня павінна адбыцца 18 жніўня ў Турцыі.

Расіяне менш гуляюць — больш скандаляць

На чэмпіянаце свету па хакеі, які праходзіць у Празе, вызначыліся чвэрцьфіналісты. Учора ўвечары згулялі паміж сабой зборныя Швецыі і Латвіі, Канады і Фінляндыі, сёння сустракаюцца каманды Чэхіі і ЗША, Славакіі і Швейцарыі.

Нагадаем, што расіяне датэрмінова "вылецелі" з васьмёркі мацнейшых, і зараз іх каманду літаральна скаланае ад скандалаў.

Так, менеджэр зборнай Расіі Аляксей Касатонаў расказаў, што напярэдадні стартавага матча іх каманды з датчанамі сакратар камітэта IIHF замерыў амуніцыю расійскага варатара Максіма Сакалова, і аказалася, што яна нестандартная. Давялося адразаць лішнія сантыметры ад шчыткоў і лавушкі.

А ўвогуле, 12 вядучых расійскіх легіянераў, якія гуляюць у НХЛ, па тых ці іншых прычынах адмовіліся гуляць за сваю зборную на гэтым чэмпіянаце.

Алесь СІВЫ.

ШАШКІ


Камбінацыйная мініяцюра

Працягваем класіфікацыйны конкурс-12. У якасці восьмага задання падаём камбінацыйную мініяцюру кандыдата ў майстры спорту Дзмітрыя Камчыцкага (Магілёў), якая мае месца ў галоўным варыянце:

Белыя: a5, c1, e5, g7 (4).
Чорныя: a3, c3, d4, f6, h8 (5).
Выйгрыш (тры ачкі).

У заданні № 12 класіфікацыйнага конкурсу-14 простая чорных a3 стаіць на a5.

Тэрмін для адказаў — традыцыйных два тыдні. Чакаем іх па адрасе: **220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля", "Шашкі".**



Некалькі мазкоў

А зараз некалькі мазкоў да эндшпілю:

1.Белыя: дамкі d8, f4 (2).
Чорныя: b2, h6 (2).
Выйгрыш.

2.Белыя: дамка d4, простая e1 (2).
Чорныя: дамка h4, простая g5 (2).
Таксама перамога белых.

3.Белыя: дамка d2 (1).
Чорныя: a5, d4, e5 (3).
Нічыя.

Яны з'яўляюцца заданнямі бліц-конкурсу-31. Кожнае з іх ацэньваецца ў адно ачко. На іх рашэнне даецца 7 дзён.

Каб навучыцца такія і іншыя мастацкія дэталі ператвараць у добрыя эцюды, дапаможа наш прыз — кніга Г.Ісаева "Творческая лаборатория шашечного этюдиста" (Кіеў, "Здоровья", 1989 г.). Пераможца конкурсу гэты падручнік якраз і атрымае.

Чэмпіянат, конкурс

У XII чэмпіянаце рэспублікі па складанні эцюдаў-64 месцы размеркаваліся такім чынам: 1.Л.Вітошкін (20,75 ачка), 2.П.Шклудаў (20), 3.В.Шульга (17,75), 4.В.Грабенка (14,5), 5.П.Кажаноўскі (13), 6.М.Зайцаў (11), 7.К.Малашкевіч (10,25), 8.І.Наўроцкі (9,5), 9.Д.Камчыцкі (8), 10.М.Грушэўскі (7). Астатнія ўдзельнікі набралі меншую колькасць ачкоў. Чэмпіён гросмайстар Леанід Вітошкін (Гомель), прызёры майстар Пётр Шклудаў (Наваполацк) і кандыдат у майстры Віктар Шульга (Мінск) — нашы пастаянныя аўтары.

У выпуску шашак за 22 сакавіка мы расказалі аб выніках трэцяга міжнароднага конкурсу на прызы пінскай газеты "ВАРЯГ-ПРЕСС" у жанры камбінацыйных праблем-64. А ў раздзеле мініяцюр-64 лепшымі сталі нашы чытачы кандыдат у майстры спорту пінчук Аляксандр Кагоцька (15 ачкоў), майстры мінчанін Барыс Іваноў (11,75) і Аляксандр Сапегін з Усполья Мсціслаўскага раёна (11). У дзесятку мацнейшых таксама трапілі мінчане І.Наўроцкі (9,5) і В.Грабенка (9,25), Д.Кульбанаў, Магілёў (8), В.Сціпанаў, Абаза (7), П.Кажаноўскі, Кашэвічы Пінскага раёна (6,25), Л.Вітошкін, Гомель (5,75) і А.Ляхоўскі, Жодзіна (5,5).

Інфармавалі нас нацыянальны суддзя вышэйшай катэгорыі мінчанін Гары Далідовіч і лаўрэат конкурсу Аляксандр Кагоцька.

Супаставім рашэнні

Праверце, калі ласка, рашэнні пазіцый, змешчаных 4 і 11 сакавіка.

"Для новых падпісчыкаў". Заданні класіфікацыйнага конкурсу-14 (М.Грушэўскі): **№1** — ab4, g3, f4, h8x. Легальнасць: (de7) b:d8 (ed6) de7 (d:f4); **№2** — dc5, bc5, f:f8, f:e7, gf2x.

"Першынство Мінска" (В.Палянскі—В.Астрынскі). Сапернікі пагадзіліся на нічыю, бо пасля 1.fg7 гульня з раўнавагай. Калі ж, 1.ab6?, дык 1... cg5 2.f:h4 fe1 3.hg5 ec3x.

"Штрых да эндшпілю". Заданне №6 класіфікацыйнага конкурсу-12 (Д.Камчыцкі): c5 (g3) b6 (d6 A) h2, f4x. A (b4) d8 (c3) a5 (b2) c3x. Рашэнне задання № 5 гэтага конкурсу мы паведамілі раней. Заданне № 3 класіфікацыйнага конкурсу-14 (М.Грушэўскі): ed8, e7, h:h4 (e3) e1x. Легальнасць cb6 (a:c5) d:b4 (a:c3).

Рашылі: В.Астрынскі, В.Палянскі, Л.Вітошкін, У.Сапяжынскі, Я.Кандрачэнка, А.Кагоцька, В.Грабенка, В.Масквіч, В.Казарэвіч, Л.Жыхар, М.Буканаў, В.Дзялендзік, Л.Пасвісцелік, А.Ашыхмін, Р.Тарасюк, М.Гардзіеўскі, В.Касцян, А.Чумакоў, Г.Логвінаў, У.Мазанік, І.Ігнацьеў, Ф.Хадачынскі, В.Таратушкін, М.Падбярэзскі, Аляксандра Камінская, А.Пярхальскі, А.Сымановіч, А.Сняжкоў, А.Белы, Ю.Сегень, П.Каролік, М.Каваленка, А.Іванькоў, А.Янчук, Д.Блахін, М.Зайцава, Б.Гальцова, В.Сямёнаў, В.Кардаш, П.Чэрнак, І.Мацкевіч, В.Краўчук, С.Супрунюк, Ч.Сінкевіч, Святлана Ламака, А.Сапегін, Ю.Агееў, Д.Кабішаў, А.Панкраценка, М.Андрушчанкаў, П.Елісееў, В.Бялоў, С.Краіла, М.Блізнец.

Радкі з пісьмаў

"Звяртаюся са словамі вялікай падзякі за тое, што вы знаходзіце магчымасць падтрымліваць найбольш неабароненую частку грамадства Беларусі — пенсіянераў, — заканчвае свой ліст з рашэннямі бабруйчанін Васіль Дзялендзік. — Шчырае дзякуй за падпіску на "Народную волю". Жадаю ўсім супрацоўнікам рэдакцыі газеты моцнага здароўя і поспехаў у нялёгкай працы ў складаны час".

"Спытаў у знаёмай гандляркі газетнага кіёска, як раскупляецца "Народная воля" ў чацвер, — піша Павел Каролік з Гомеля. — Было прыемна пачуць, што ў гэты дзень газетай часцей цікавяцца з-за выпускаў у ёй шашак і шахмат".


"Частку сваёй уласнай шашачнай літаратуры падарыў юнакам з Гродна, Бабруйска, Глыбокага. Яны ўдзельнічалі ў рэспубліканскім турніры "Зіянне зорак", — працягвае Аляксандр Іванькоў са Жлобінскага раёна. — Ваша рубрыка "Шашкі" падабаецца, бо ў ёй ёсць і матэрыялы для практыкаў, і вынікі самых разнастайных спаборніцтваў".

Мікалай ГРУШЭЎСКІ, майстар спорту.

ШАХМАТЫ

Этюд Р.Ретч

Белые: Kpf6, Kf8, пп.d3, e6 (4).
Черные: Kpc8, Лd6 (2).
Выигрыш.



Выдающийся чешский гроссмейстер Рихард Ретч (1889—1929) в 20-е годы прошлого столетия входил в число сильнейших шахматистов мира. Он был победителем ряда международных турниров, установил рекорд игры вслепую в сеансе одновременной игры на 29 досках. Не менее прославился Ретч как шахматный новатор, прокладывавший новые пути в шахматной стратегии и тактике. Он разработал дебютную систему, получившую название "Дебют Ретч", которая и сейчас находится на вооружении шахматистов.

Высокое мастерство проявил чешский гроссмейстер в шахматной композиции, особенно в составлении этюдов. Один из его знаменитых этюдов мы предлагаем вниманию читателей. Попробуйте найти решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".**

На пьедестале — братья Жигалко

В Минске в Центре олимпийской подготовки по шахматам и шашкам прошло первенство Беларуси по шахматам среди юношей и девушек в возрасте до 20 лет. Среди участников соревнований были спортсмены, уже зарекомендовавшие себя в ряде престижных турниров.

У юношей за титул чемпиона и путевки на чемпионаты мира и Европы вели борьбу 8 шахматистов. Соревнования проводились по круговой системе в два круга. С наибольшим успехом выступал самый молодой участник чемпион мира и Европы среди юношей в возрасте до 14 лет 2003 года минчанин Сергей Жигалко. Со старта, правда, лидерство захватил кандидат в мастера, участник высшей лиги чемпионата Беларуси среди мужчин 2004 года Андрей Горовец (Витебск). Но в пятом туре он проиграл международному мастеру Никите Майорову, и его опередил Сергей Жигалко. Свое лидирующее положение он не уступил до самого финиша. Уже за тур до конца Сергей обеспечил себе победу. В итоге, показав отличный результат — 10,5 очка из 14 возможных, он на полтора очка опередил своего старшего брата 19-летнего международного мастера Андрея Жигалко, завоевавшего серебряную медаль. Борьба за призовые места была очень острой, к последнему туру на серебро претендовали три участника — Андрей Жигалко, Никита Майоров и Андрей Горовец. Однако Майоров проиграл кандидату в мастера, чемпиону республики среди юношей до 18 лет Юрию Глызину (Минск), а его конкуренты свои поединки завершили вничью. В итоге вторым был А.Жигалко — 9 очков, третьим — А.Горовец — 8,5. Такой же результат, как и Горовец, показал Майоров, но по дополнительным показателям ему было присуждено четвертое место. Пятым финишировал Юрий Глызин — также 8,5 очка. Интересно, что первый круг он попросту провалил, набрав 3 очка из 7. Зато во втором круге преобразился, показав лучший результат — 5,5 из 7 возможных!

У девушек борьбу за медали и путевки на чемпионаты мира и Европы вели 5 спортсменок. Здесь также турнир проводился в два круга. Борьба за победу была острой и бескомпромиссной. Успеха добилась 16-летняя минчанка, кандидат в мастера Елена Климец, набравшая 6 очков из 8 возможных. Интересно, что ранее Климец добилась победы в чемпионате Беларуси среди девушек в возрасте до 18 лет, а вот в своей возрастной группе — до 16 лет в чемпионате была лишь второй. На очко от чемпионки отстала гомельчанка кандидат в мастера Александра Савурко. А бронзовую медаль выиграла мастер спорта, минчанка Ирина Кирик.

Итак, определились спортсмены, которые будут представлять нашу страну на чемпионатах мира и Европы во всех возрастных группах. Пожелаем им успеха в борьбе за высокие места на мировых и европейских форумах.

В копилку миниатюр

Следующую короткую партию предложил нам минчанин ветеран шахмат Владимир Петрович Демидов. В начале 50-х годов, будучи студентом, он с успехом выступал в чемпионатах Минска и спортивного общества "Наука". Затем пришлось оставить шахматы, работа не оставляла на это времени. Сейчас, выйдя на пенсию, вспомнил старое увлечение.

Следующая партия была сыграна в чемпионате Минска 1952! года. В столице тогда не было шахматного клуба, играли в летнем павильоне в парке Горького.

В.Демидов — А.Голутвин
Староиндийская защита

1.d4 Kf6 2.c4 d6 3.Kc3 g6 4.Kf3 Kb d7 5.e4 e5 6.de de 7.Cg5 Cg7. Не ожидая последовавшей жертвы. 8.K:e5! Смелое решение. 8...K:e5 9.Ф:d8+ Kp:d8 10.Kd5 Keg4. (Если 10...Ked7, то 11.e5! Ле8 12. о-о-о! Отыгрывая фигуру). 11.e5! h6. Следовало играть 11...Ле8 12.C:f6+ K:f6 13.ef Ле8+ 14.Ce2 Ch8. В надежде отыграть пешку f6, но события развиваются иначе. 15.о-о-о Cd7 16.Cg4 h5 17.Kb6! **Черные сдались.**

А авторами следующей миниатюры были гроссмейстеры, выступавшие на международном турнире "Аэрофлот-2004" в Москве.

Ж.Лотье (Франция) — Л.Юртаев (Киргизия)
Староиндийская защита

1.d4 Kf6 2.c4 g6 3.Kc3 Cg7 4.e4 d6 5.f3 о-о 6.Ce3 Kbd7 7.Фd2 c5. Чаще встречается план с ходом e7—e5. 8.Kge2 a6 9.Ch6 C:h6 10.Ф:h6 b5 11.h4 e5 12.de K:e5 13.Kf4 b4 14.Kd1 Ле8. (Заслуживало внимания 14...Ke8! с намерением контратаковать пешкой f5) 15.Ke3 cb7 16.Ce2 Kc6? Потеря времени скоро скажется. 17.h5 Kd4 18.hg fg 19.Kg4! (Не проходило 19.K:g6 ввиду ответа 19...C:e4 20.fe Л:e4 с сильными угрозами. Теперь же удовлетворительной защиты у черных не оказывается). 19...C:e4. Вынужденно. 20.Фh4! Kh5 21.K:h5 Ф:h4+ 22.Л:h4 Cd3 23.Kgf6+ Kph8? Упорнее было 23...Kpf7. 24.Kg3. Грозит мат в один ход. 24...g5? 25.Л:d4! **Черные сдались.**

6
май

ЧАЦВЕР
Усх. 5.23 Зах. 20.52
Даўж. дня 15.29
Поўня 4 мая

100 гадоў з дня нараджэння П.А. Труса (1904—1929), беларускага паэта
95 гадоў з дня нараджэння А.М. Коха (1909—1972), беларускага жывапісца

ХОДЗЯЦЬ ЧУТКІ, ШТО...

Уладзімір Парфяновіч з'язджае за мяжу

Некаторыя высокапастаўленыя чыноўнікі, якія час ад часу трымаюць слова ў Авальным зале і адказваюць на пытанні дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, кажуць, што ў бліжэйшы час адзін з самых актыўных парламентарыяў Уладзімір ПАРФЯНОВІЧ вымушаны будзе эмігрыраваць з краіны.

Сам Парфяновіч не хавае, што вакол яго дома амаль штодзённа дзяжураць машыны вонкавага назірання. І што больш шасці месяцаў у яго не працуе хатні тэлефон, аднак спраўна спрацоўвае ахоўная сігналізацыя. Інжынеры, якія займаюцца абслугоўваннем сігналізацыі, не могуць зразумець, як такое можа быць...

У размове з журналістам "Народнай волі" вядомы спартсмен, бізнесмен і дэпутат пацвердзіў, што амаль праз два тыдні з'язджае з Беларусі.

"Так, я на самай справе з'язджаю, — сказаў Парфяновіч. — ***Спачатку ў складзе нацыянальнай каманды на чэмпіянат Еўропы ў Познань. Потым — у Берлін на сустрэчу з міністрам замежных спраў Германіі Йошкам Фішэрам, і ў Брусель на сустрэчу з Хаўерам Саланам і кіраўніком парламента Савета Еўропы Рамана Продзі. На гэтым мая "эміграцыя" скончыцца, і я вярнуся на радзіму..."***

Даша ПАЎЛОЎСКАЯ.

Четверг, 6 мая

БТ

07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12,00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Новости.
07.05, 07.35, 08.10, 08.35 "Доброе утро, Беларусь!".
07.30, 08.30, 19.55 "Деловая жизнь".
09.15, 19.15 "Сага о форсайтах". Сериал.
10.05, 20.00 "Семнадцать мгновений весны". Сериал.
11.00, 17.30 "Богатые и знаменитые". Сериал.
12.10 "Евровидение-2004".
12.25 "Люди и звери". Сериал.
14.15 "Точка".
15.10 "Самые, самые, самые". Сериал.
16.05 "5х5".
17.15 "Нюрнбергский процесс — новая история".
18.30 "Новая коллекция" Олега Лукашевича".
21.00 "Панорама".
21.50 "Права человека. Взгляд в мир".
22.00 "Вишневые ночи". Драма.
23.40 "Клип-обойма".

ОНТ

07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 18.00, 20.30, 23.15 "Наши новости".
07.05 "Наше утро".
09.05, 19.05 "Клон". Сериал.
09.55. 18.10 "Дом". Реалити-шоу.
10.45, 23.30 "Фабрика звезд-4".
11.10 "Дисней-клуб".
15.00 "Город женщин".
15.55 "Берег мечты". Сериал.
16.50 "Большая стирка".
20.00 "Время".
21.05 "Как бы не так". Сериал.
22.10 "Улицы разбитых фонарей". Сериал.

РОССИЯ

07.45 "Тартарен из Тараскона". Комедия.
08.50 "Короткое замыкание". Ток-шоу.
09.50, 22.35 "Вести. Дежурная часть".
10.00, 16.00, 19.00 "Вести".
10.30, 19.30, 22.15 "Местное время. Вести — Москва".
10.50 "Что хочет женщина".
11.50 "Комната смеха".
16.10 "Госпожа победа". Сериал.
17.05 "Комиссар Рекс". Сериал.
18.00 "Городок".
19.50 "Спокойной ночи, малыши!".
19.55 "Не будите спящую собаку". Комедия.
22.50 "Вундеркинды". Худ.фильм.

ЛАД

06.30 EURONEWS.
08.00, 14.00, 20.00 Новости.
08.10 "Площадь искусств".
08.35, 22.05 "Россия молодая". Сериал.
09.25 "Ералаш".
09.35 "Здоровье".
10.05 "Между нами, женщинами". Тележурнал.
10.30, 21.15 "Грешная Анхелика". Сериал.
11.15, 13.00 "Обычный необычный день".
11.45 "Последний визит". Худ.фильм.
13.30 Мультфильмы.
14.10 "Мультиклуб".
15.05 "Команда "SOS". Сериал.
15.30 "Не зевай!".
15.40 "Бум". Тележурнал для школьников.
16.20 "Легендарные самолеты". Док.фильм.
16.45 "Сердце не камень". Драма.
17.55 Футбол. "Динамо" (Минск) — "Торпедо-СКА".
20.15 "Колыбельная".

НТВ

09.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00 "Сегодня".
09.20 "Свидетель века".
09.30, 11.20 "Государственная граница", "Красный песок". Сериал.
15.20 "Женский взгляд".
15.55 "Однажды в России".
16.25 "Внимание: розыск!".
17.05 "Неизвестная война".
18.35 "Тупой еще тупее". Комедия.
21.30 "Театр имени СССР".
22.20 "Джек Булл". Худ.фильм.

СТВ+RenTV

06.15, 18.00 "Минщина. Люди, события, факты".
06.25, 15.35 "Пауэр Рейнджэрс, или Могучие рейнджеры в космосе". Телесериал.
06.50 "Ну, погоди". Мультфильмы.
07.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 "24 часа".
07.50, 20.00 "СТВ-спорт".
08.05, 20.15 "Тема дня".
08.20, 23.05 "Технология".
08.35 "Судьбы своей хозяйка".
09.05 "Только ты". Мелодрама..
10.50 "Черный лев". Док.фильм.
11.30 "Ecce Homo".
11.45, 20.40 "Фильм, фильм, фильм".
12.00 "Час суда".
13.00 "Дикая планета".
13.50, 18.30 "Инструктор". Сериал.
14.50 "ОБЖ, или Обезображенные". Сериал.
15.20 Мультфильм.
16.00 "Веселые баксы".
16.15 "Добро пожаловаться...".
17.00 "Медики". Сериал.
18.15 "Театральные истории".
20.25 "Добрый вечер, малыш...".
20.55 "Опасные герои". Боевик.
23.15 "Турпоход".
23.25 "Новости мировой шоу-индустрии".
00.10 "Секретные материалы". Сериал.
00.55 "Новости СНГ".

8-Й КАНАЛ

17.30 "Мультпарад" от "Бюргера".
17.45 "Двойная жизнь". Худ.фильм.
19.15 "Знакомьтесь — Беларусь!"
19.25 "Атомик Филмз" и "К-видео" представляют...
19.30 "Тени исчезают в полдень". Сериал.
20.45 "Вечарніца".
21.00 "Региональный репортаж".
21.15 "Убийцы". Боевик.

ТВ ЦЕНТР

04.45 "Настроение".
07.35 Газетный дождь.
07.45 "Нет спасения от любви". Сериал.
09.40 "Войди в свой дом".
09.45 Телемагазин.
10.00, 13.00, 17.00. 21.00 События. Время московское.
10.15 "Дата".
11.05 "Ностальгия". "Формула успеха".
12.05 "Прорыв".
12.30 "Пошехонская быль".
12.45 "Доходное место".
13.15 "Инспектор Кресс". Сериал.
14.20, 18.45 "Конструкторское бюро "Салют" — 5 лет".
14.30 "21-й кабинет" с Виктором Белицким.
15.00 "Регионы: прямая речь".
15.30 "Тайна зеленой комнаты".
15.50 "Орле преславный". Мультфильм.
16.00 "Уголовная полиция". Сериал.
17.15 Московские перекрестки" с Олегом Табаковым".
18.00 "Страсти по Саломее". Сериал.
18.50 "Освобождение". "Прорыв". Худ.фильм.
20.40 "Разбогатеть на старине". Спецрепортаж.
21.10 Чемпионат мира по хоккею. 1/4 финала. Трансляция из Праги (в перерывах — "События. Время московское").
23.45 25-й час. События. Время московское.
00.10 Чемпионат мира по хоккею. 1/4 финала. Передача из Праги.

EUROSPORT

09.30 Мотокросс. Чемпионат мира в Германии.
10.00 Футбол. Планета ЕВРО.
10.30 Футбол. Поколение чемпионов ЕВРО-2004.
11.00 Снукер. Чемпионат мира.
13.00 Теннис. Турнир WTA в Германии.
17.30 Бокс.
18.00 Футбол. Чемпионат Европы среди юниров во Франции.
21.45 Супергонки по выходным. Журнал.
22.45 Сумо. Гранд-турнир (Башо).
23.45 Новости "Евроспорта".
00.00 Футбол. Кубок УЕФА.
01.00 Футбол. Лига чемпионов УЕФА.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс(017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Нумар газеты аддрукаваны з дыяпазітываў заказчыка на ААТ «Красная звезда», 220073, г.Мінск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Падпісаны ў друк у 15.00. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж: 27 500 экз. Заказ № 640.